**Бітук А.Т., настаўнік**
**беларускай мовы і літаратуры**

**Тэма:** К. Крапіва. Звесткі пра жыццё і дзейнасць. Камедыя “Хто смяецца апошнім”. Адмоўныя вобразы п’есы.

**Мэта:** *адукацыйная:*
арганізаваць дзейнасць вучняў па абмеркаванні асноўных праблем п’есы
вучыць суадносіць учынкі герояў з матывамі іх паводзін,
вучыць даваць маральную ацэнку негатыўным паводзінам героя;
*развіццёвая:*
развіццё пазнавальнай актыўнасці вучняў,
развіццё вуснага маўлення,
развіццё ўмення выказваць свае думкі і даваць ім абгрунтаванне,
развіццё ўмення вучняў працаваць у групах,
развіццё ўмення працаваць са слоўнікам літаратурных тэрмінаў,
развіццё крытычнага мыслення ў вучняў;
*выхаваўчая:*
выхоўваць любоў і павагу да роднага слова,
выхаванне патрыятычных і міралюбівых пачуццяў,

Абсталяванне: падручнік “Беларуская літаратура” для 10-га класа, лісты для стварэння стужкі часу, фотаздымкі герояў з кінафільма, відэазапіс байкі К. Крапівы “Дыпламаваны баран”, лісты-схемы, ацэначныя лісты, шыльды з назвамі груп, партрэт пісьменніка.

## Ход урока

### 1. Арганізацыйны момант

НАСТАЎНІК: Вітаю вас! Прапаную пачаць урок з загадкі. Я пакажу вам мультфільм, а вы мне скажаце, пра каго сёння пойдзе размова (*дэманструю мультфільм “Дыпламаваны баран”, вучні адказваюць).*Так, правільна, сёння будзем гаварыць пра К.Крапіву. Зыходзячы з тэмы ўрока, разам вызначым задачы.

ВУЧАНЬ: Аднавіць і пашырыць веды пра асобу пісьменніка. Вызначыць і абгрунтаваць жанр твора. Выявіць адмоўных герояў твора.

### 2. Падрыхтоўка вучняў да ўспрыняцця новага матэрыялу.

НАСТАЎНІК: Я прасіла вас прачытаць п’есу “Хто смяецца апошнім”

К. Крапівы, па магчымасці, праглядзець фільм, зняты на кінастудыі “Беларусьфільм” у 1956 годзе.

**Гутарка па сюжэце твора:**

-Дзе адбываюцца падзеі? (*інстытут геалогіі);*

-У які час?(*канец 30-х гадоў 20 ст.);*

-Хто галоўны герой твора*?(Гарлахвацкі)*

-Якую пасаду займае? Як папаў сюды? (*дырэктар інстытута, дапамаглі сябры заняць пасаду);*

-Каб утрымацца на пасадзе, яму трэба напісаць навуковую працу. Што ён для гэтага прадпрыймае? (*шантажыруе Тулягу, застаўляе яго напісаць працу для сябе).*

-Як заканчваецца твор?(*Туляга разам з сябрамі выкрывае ілжэвучонага Гарлахвацкага).*

**3. Вывучэнне новай тэмы**

НАСТАЎНІК: Работу арганізуем наступным чынам: раздзелімся на групы.1-я група-“Біёграфы”; 2-я група-“Літаратуразнаўцы”; 3-я група-“Аналітыкі”. Кожная з груп атрымлівае сваё заданне, працуе 10 хвілін, у час працы запаўняеце картку ацэнкі ўдзелу кожнага групоўца.

НАСТАЎНІК: Дзелімся на групы. Стаўлю задачы групам: 1-я група стварае стужку часу жыцця і дзейнасці К.Крапівы. З асабістай калекцыі кніг даю вам для даследвання кнігу 1948 года выдання. Адказаць на пытанне: якое дачыненне яна мае да К. Крапівы?

2-я група дае адказы на літаратуразнаўчыя пытанні, дапоўніць схему(дадатак1). Адказаць на пытанне: што такое тэорыя бесканфліктнасці?

3-я група вызначае адмоўных герояў, дае ім характарыстыку, выкарыстоўваючы фотаздымкі з кінафільма.

**Выступленні груп**

НАСТАЎНІК: Перад тым, як групы пачнуць абараняць свае праекты, прашу кожную з груп падрыхтаваць пытанні па тэмах выступаючых груп. На працягу выступленняў клас запісвае асноўныя паняцці, факты, звесткі.

(*групы абараняюць свае праекты, каменцірую і выстаўляю адзнакі)*

**4. Падвядзенне вынікаў**

НАСТАЎНІК: Ці справіліся вы з пастаўленымі задачамі? Што было найбольш складаным?

**5. Рэфлексія**

НАСТАЎНІК: На партах у вас ляжаць QR-коды, сканУйце іх, запішыце па два словы-асацыяцыі з тэмай і зместам урока, ствараем воблака слоў.

**6. Дамашняе заданне**

1-ы варыянт характарызуе герояў: Веру, Тулягу, Левановіча;

2-і варыянт -Чарнавуса, цёцю Кацю, Нічыпара;

Заданне па жаданні: с.192, пыт.12.

Дадатак 1

**Заданні для 1-й групы**

1. Стварыць стужку часу жыцця і дзейнасці К.Крапівы (падручнік с. 182-184);
2. Адказаць на пытанне: як кніжка з калекцыі старых кніг звязана з асобай пісьменніка?
3. Сапраўднае прозвішча пісьменніка? Сэнс псеўданіма?

**Заданні для 2-й групы**

1. Даказаць, што твор “Хто смяецца апошнім” адносіцца да драматургічнага спосабу адлюстравання жыцця?
2. Даказаць, што перад намі сатырычная камедыя?
3. Адказаць на пытанне: што такое тэорыя бесканфліктнасці?
4. Знайсці ў слоўніку літаратурных тэрмінаў тлумачэнне слоў *рэмарка, маналог, дыялог, канфлікт.*

**Заданні для 3-й групы**

1. Вызначыць адмоўных герояў п’есы;

2. Даць характарыстыку адмоўным героям п’есы “Хто смяецца апошнім” (ст. 189-191);

3. Раскрыць сэнс прозвішчаў Гарлахвацкі, Зёлкін.

Дадатак 2


Пішуцца для пастаноўцы на сцэне
Характары герояў раскрываюцца праз паводзіны, учынкі, выказванні
Драматычныя жанры: драма, трагедыя, камедыя
Адступіцае аўтарскі аповед, ёсць тлумачэнні, як выглядае сцэна і аўтарскія рэмаркі
Мае форму дыялога, ёсць маналогі


Характары падаюцца ў смешным, недарэчным выглядзе
Замест сюжэта ў творы разгортваецца канфлікт
Сатырычная камедыя
Выкрываюцца заганы жыцця
Заканчваецца шчаслівай развязкай для станоўчых герояў
Станоўчыя героі змагаюцца з адмоўнымі

Дадатак 3









# Высновы

Урок па тэме “К.Крапіва. Звесткі пра жыццё і дзейнасць. Камедыя “Хто смяецца апошнім”. Адмоўныя вобразы п’есы”-урок тлумачэння новага матэрыялу

Пастаўленыя задачы адпавядалі тэме і  патрабаванням вучэбнай праграмы па прадмеце. Была арганізавана папярэдняя падрыхтоўка вучняў, якім прапанавалася дома прачытаць камедыю “Хто смяецца апошнім”, праглядзець кінафільм кінастудыі “Беларусьфільм”,1956 г.

На этапе арганізацыйнага моманту выкарыстоўваўся прыём візуалізацыі, навучэнцам прапанавалася праглядзець мультфільм “Дыпламаваны баран”. Такім чынам вызначыць, пра каго пойдзе размова. Разам з вучнямі вызначылі задачы.

На наступным этапе ўрока па падрыхтоўцы вучняў да ўспрымання новага матэрыялу было праведзена франтальнае апытванне па змесце п’есы.

На этапе вывучэнне новай тэмы выкарыстоўваўся  групавы прыём.    Усе вучні падзяліліся на тры групы: “Біёграфы”, ”Літаратуразнаўцы”, ”Аналітыкі”, кожная з іх атрымала сваё заданне (дадатак1). На дадзеным этапе ўрока- пошукава-даследчы метад. Першая група знаёмілася з жыццё і дзейнасцю пісьменніка, вынікам працы групы стала стварэнне стужкі часу. Другая група даследавала літаратуразнаўчыя пытанні, вынік- дапоўніць схемы (дадатак 2).Трэцяя група вызначала адмоўных герoеў, давала ім характарыстыку, выкарыстоўваючы фотаздымкі герoеў з кінафільма. Вынік- запаўненне табліцы.

Падвядзенне вынікаў, рэфлексія- па асабістаму QR-коду дзеці разам стваралі воблака слоў у анлайн рэжыме. Дамашняе заданне мела дыферынцыраваны выгляд (рознаўзроўневыя заданні, заданне  творчага характару па жаданні).